3/57108(СБ)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

# НОВЫЯ КНІГІ

## ПА СТАРОНКАХ БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ



## У НУМАРЫ

*Даты беларускага календара*

*чэрвень – жнівень*

5
2021

# НОВЫЯ КНІГІ:
## па старонках беларускага друку

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ
БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

Штомесячны
бібліяграфічны
бюлетэнь

*Заснаваны ў 1960 г.*

ЗМЕСТ


Навука і веды ў цэлым. Арганізацыя. Інфарматыка. Інфармацыя. Дакументацыя. Бібліятэчная справа. Установы. Публікацыі . . . . . 2

Філасофія. Псіхалогія . . . . . 8

Рэлігія. Тэалогія . . . . . 8

Грамадскія навукі . . . . . 10

Матэматыка. Прыродазнаўчыя навукі . . . . . 17

Прыкладныя навукі. Медыцына. Тэхналогія . . . . . 19

Мастацтва. Адпачынак. Спорт . . . . 22

Мова. Моваўнаўства. Лінгвістыка. Літаратура . . . . . 27

Геаграфія. Біяграфія. Гісторыя . . . 29


Да нумара прыкладаюцца
«Даты беларускага календара
(чэрвень – жнівень)»


5
2021



Учреждение культуры
«Брестская областная
библиотека имени
М. Горького»



Мінск

**Какарeко, В.** Монетное дело Александра Казимировича (1492–1506) / Виктор Какареко // Банкаўскі веснік. – 2008. – № 7. – С. 61–68.

## 6 жніўня – 75 гадоў з дня нараджэння В. І. Локун (1946–2016), літаратуразнаўца, крытыка

Галоўным кірункам дзейнасці Валянціны Іванаўны Локун з'яўлялася кампаратывістыка ці параўнальнае літаратуразнаўства. Яе грунтоўныя навуковыя працы, артыкулы і выступленні адлюстроўваюць узаемасувязі беларускай літаратуры з рускай, украінскай, польскай, нямецкай, англійскай, французскай і інш.

Нарадзілася В. Локун у в. Цепянец Пінскага раёна Пінскай (цяпер Брэсцкай) вобласці ў сялянскай сям'і. У 1966 г. скончыла Пінскую завочную школу і паступіла на філалагічны факультэт (рускае аддзяленне) Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Працавала загадчыцай Цепянецкай бібліятэкі (1972–1974). Завочна вучылася ў аспірантуры пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. У 1984 г. В. Локун абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Стилевое своеобразие современной белорусской военной прозы (на материале творчества В. Быкова, Б. Саченко, И. Чигринова, 60–70 годы)». У 1985–1998 гг. выкладала ў Брэсцкім педагагічным інстытуце імя А. С. Пушкіна. У 1987–2007 гг. была навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, адначасова да 1998 г. працавала ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага.

Першыя публікацыі В. Локун з'явіліся ў 1973 г. у пінскай раённай газеце «Полесская правда». З канца 1970-х гг. яна пачала выступаць з рэцэнзіямі і артыкуламі ў рэспубліканскіх часопісах «Нёман», «Полымя», «Роднае слова», газеце «Літаратура і мастацтва» і інш. У іх асвятляліся праблемы развіцця беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай. Таленавітая і ўдумлівая даследчыца В. Локун паспела шмат зрабіць у літаратурнай крытыцы і беларускім літаратуразнаўстве. У 1995 г. выйшла яе манаграфія «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гг.», у якой разглядаюцца творы Я. Брыля, В. Быкава, А. Адамовіча, І. Навуменкі, І. Шамякіна ў суаднясенні з развіццём эстэтычнай думкі рускай літаратуры (Ю. Бондараў, Р. Бакланаў, К. Сіманаў, В. Кандрацьеў, Б. Васільеў і інш.). У кнізе падкрэсліваецца філасофская шматаспектнасць гістарычнай прозы У. Караткевіча. У наступнай манаграфіі «Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры» (2005) аўтар даследуе творчасць беларускага пісьменніка ў параўнанні і супастаўленні з літаратурай «страчанага пакалення», прадстаўнікамі якога былі Э. М. Рэмарк, Э. Хемінгуэй, Р. Олдынгтан, У. Фолкнер і інш. Яна выяўляе таксама тыпалагічныя сувязі твораў В. Быкава з экзістэнцыяльнай літаратурай (Ф. Дастаеўскі, А. Камю, Ж. П. Сартр і інш.). Літаратурна-крытычныя артыкулы В. Локун увайшлі ў зборнікі «Да новых вышынь» (1991) і «Кругі жыцця, кругі літаратуры» (2002). У іх разглядаюцца ідэйна-мастацкія асаблівасці творчасці многіх беларускіх і рускіх пісьменнікаў (І. Чыгрынава, В. Казько, В. Карамазава, А. Асіпенкі, У. Дамашэвіча, Ю. Бондарава, В. Астаф'ева, В. Бялова і інш.), закранаюцца актуальныя праблемы развіцця нацыянальнай прозы (на матэрыяле творчасці І. Мележа), аналізуюцца асобныя творы А. Жука, А. Масарэнкі, В. Коўтун і інш. Валянціна Локун прымала таксама ўдзел у стварэнні кніг «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» (у 4-х тамах, 1999–2002: напісала чатыры раздзелы (т. 3, 4)), «Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей» (2002, у 2003 г. выдадзена на ўкраінскай мове ў Кіеве), «Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX–XX стст.» (2006).

У 1998 г. В. Локун была прынята ў Саюз беларускіх пісьменнікаў, у 2006 г. стала членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Яна двойчы лаўрэат прэміі часопіса «Полымя»: у 1993 г. за артыкул «У пошуках маральнага ідэалу. Проза Уладзіміра Караткевіча» (змешчаны ў № 6) і ў 2001 г. за артыкул «Узняцца да лёсу агульначалавечага» (надрукаваны ў

№ 5). У 2004 г. была ўдастоена прэміі прэзідэнтаў акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы за працу «Культурно-исторические белорусско-украинские связи: литературно-языковый аспект». За актыўны ўдзел у рабоце Міжнароднага фонду Святой Еўфрасінні Полацкай В. Локун узнагароджана ў 2006 г. медалём Святой Еўфрасінні Полацкай. У 2012 г. яна стала лаўрэатам прэміі Беларускага саюза жанчын.

*Працы В. І. Локун*

**Васіль Быкаў** у кантэксце сусветнай літаратуры / В. І. Локун. – Мінск : Тэхнапрынт, 2005. – 227 с.

**Маральна-філасофскія** пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы, 1950–1960-я гг. / В. І. Локун ; Акадэмія навук Беларусі, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 110 с.

**Круті** жыцця, круті літаратуры / Валянціна Локун – Мінск : БелАКК, 2002. – 271 с.

*Аб жыцці і творчасці літаратуразнаўца*

**Локун Валентина Ивановна** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 2. – С. 32.

**Локун Валянціна Іванаўна** // Памяць : Пінскі раён / [рэдкалегія: Г. К. Кісялёў і інш.]. – Мінск, 2003. – С. 484–485.

**Локун Валянціна Іванаўна** // Памяць : Пінск / [укладальнікі: В. М. Курсаў, С. Ф. Шапіра ; рэдкалегія: Г. К. Кісялёў і інш.]. – Мінск, 1998. – С. 500.

**Локун Валянціна Іванаўна** // Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі : біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі / [складальнік Н. М. Парчук ; пад рэдакцыяй Т. А. Дземідовіч]. – Брэст, 2018. – С. 118–123.

**Локун Валентина Ивановна** // Учёные Пинщины / Пинский городской исполнительный комитет [и др. ; авторы-составители: П. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий]. – Пинск, 2012. – С. 81.

**Локун Валентина Ивановна** // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах Пинщины / [автор-составитель Кибак П. А.]. – Минск, 2004. – С. 134.

**Валянціна Локун** // Піншчына літаратурная: вершы, проза / [рэдкалегія: М. І. Ляшук (галоўны рэдактар) і інш.]. – Пінск, 1999. – С. 102–103.

**Валянціна Локун** // Літаратурная карта Берасцейшчыны / [рэдактар і ўкладальнік А. Крэйдзіч ; рэдакцыйны савет: Л. А. Цупрык (старшыня) і інш.]. – Брэст, 2008. – С. 464–466.

## 15 жніўня – 190 гадоў з дня нараджэння В. А. Каратынскага (1831–1891), беларускага і польскага паэта, публіцыста, перакладчыка

Вінцэсь Аляксандравіч Каратынскі з'яўляецца адным з найбольш вядомых літаратараў і журналістаў 50-х гг. XIX ст. Дэмакратызм і гуманістычны пафас яго творчасці аказалі значны ўплыў на станаўленне беларускай літаратуры.

Нарадзіўся В. Каратынскі ў в. Селішча Навагрудскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці) у сям'і былога прыгоннага селяніна. Яго першым настаўнікам быў мясцовы арганіст, які навучыў чытаць і пісаць, дапамог засвоіць асновы арыфметыкі. Потым В. Каратынскі займаўся самаадукацыяй: шмат чытаў, перапісваў для сябе кнігі. Атрыманых ведаў хапіла, каб заняцца абучэннем малодшых братоў, а потым працаваць хатнім настаўнікам на Навагрудчыне. У 1850 г. В. Каратынскі стаў сакратаром У. Сыракомлі, які жыў у фальварку Залучча. Ён перапісваў гатовыя вершы і пераклады (пераважна лацінамоўных аўтараў), адказваў на лісты і адначасова ўдасканальваў свае веды. У хуткім часе самастойна авалодаў некалькімі замежнымі мовамі, што дазволіла пазней займацца перакладамі. Двухгадовая праца ў Залуччы стала для В. Каратынскага